# Няхай жыве ў вяках імя і справа Уладзіміра Ільіча Леніна!

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 мая 1982 года).*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1982
15
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 14 (1352)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

па кнізе Л. І. Брэжнева «Успаміны» прайшла на філалагічным факультэце. Сваімі ўражаннямі аб прачытаным падзяліліся першакурснікі А. Кубай, Я. Круглік, І. Дзялоўская. Затым аб асабістых сустрэчах у час Вялікай Айчыннай вайны з Леанідам Ільічом Брэжневым расказаў госць студэнтаў, палкоўнік у адстаўцы М. І. Аносаў.

**Л. КАМАІШКА,**
**студэнтка філфака.**

### ПАСПЯХОВА ПРАХОДЗІЦЬ

ва універсітэце зверка прафсаюзнай дакументацыі. Яна дапаможа выявіць недахопы ў афармленні прафсаюзных білетаў і картак.

**Р. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

### АБАНЕМЕНТ

навуковай і мастацкай літаратуры праводзіць чарговы адкрыты агляд літаратуры па тэме «Матэматыка ў сучасным свеце».

**Г. ШАЦІЛА,**
**супрацоўніца бібліятэкі.**

### У ПРАГРАМЕ

Усесаюзнага тыдня музыкі для дзяцей і юнацтва прынялі ўдзел універсітэцкія народныя калектывы мастацкай самадзейнасці. Яны выступілі з канцэртамі ў Радашковіцкай школе-інтэрнаце, у Станькаўскай сярэдняй школе і ў ПТВ № 3 г. Мінска.

**Л. БАРАНОЎСКАЯ,**
**інструктар студэнцкага клуба.**

### ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

літаратурнага аб'яднання «Узлёт» (кіраўнік А. А. Лойка) адбудзецца на філалагічным факультэце (вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 20) сёння, 15 красавіка, у 19.00. Запрашаюцца пачынаючыя паэты і празаікі.

**С. ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака, член літаб'яднання.**

## 18 КРАСАВІКА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ НАВУКІ



**Загадчык галіновай навукова-даследчай лабараторыі фізічных метадаў і сродкаў дыягнастычнага кантролю дацэнт Уладзімір Іванавіч Мікуловіч — адзін з таленавітых маладых вучоных. Ён прыцягвае да актыўнай навуковай работы студэнтаў і аспірантаў.**

**НА ЗДЫМКУ: пад кіраўніцтвам дацэнта У. І. Мікуловіча (у цэнтры) настройку аналізатара вібрацыі вядуць нядаўнія выпускнікі факультэта радыёфізікі і электронікі інжынеры Павел Каржукоў і Уладзімір Вярбіцкі.**

Фота **В. Шачака.**

# НА МАРШЫ — «ЧЫРВОНАЯ СУБОТА»

**КАЛЕКТЫЎ УНІВЕРСІТЭТА ГОРАЧА ПАДТРЫМАЎ ПАЧЫНАННЕ ПЕРАДАВЫХ МАСКОЎСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ АБ ПРАВЯДЗЕННІ КАМУНІСТЫЧНАГА СУБОТНІКА, ПРЫСВЕЧАНАГА 112-й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА**

ПАЙШОЎ трэці тыдзень, як студэнты і супрацоўнікі універсітэта сталі на вахту ленінскага камуністычнага суботніка. Актыўна працуе штаб па яго арганізацыі і правядзенню, які ўзначальвае намеснік сакратара парткома БДУ імя У. І. Леніна П. Л. Салаў. Акрамя прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый універсітэта, членамі штаба з'яўляюцца намеснікі дэканаў усіх факультэтаў. Яны, у сваю чаргу, курыруюць работу адпаведных штабоў у падраздзяленнях.

Дакладна выконваецца складзены штабам графік работ. Будаўніча-мантажнаму ўпраўленню № 7 дапамагалі добраўпарадкаваць тэрыторыю дзіцячага сада № 43 студэнты-гісторыкі. На тэрыторыі чацвёртай клінічнай бальніцы працавалі камсамольцы факультэта прыкладной матэматыкі. На ўборцы вуліц у дарожна-эксплуатацыйным упраўленні Маскоўскага раёна выдатна працавалі будучыя фізікі і матэматыкі (мехмат). Іх зменяць філолагі і хімікі. Аб'ектам ударнай працы журналістаў і выхаванцаў падрыхтоўчага аддзялення стала вуліца «Праўды». Студэнты біяфака праводзяць «чырвоную суботу» на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі «Шчамысліца».

У акуратнай папцы з надпісам «Камуністычны суботнік» у начальніка штаба працоўных спраў універсітэта Алега Чулкова сабраны даведкі аб рабоце асобных студэнцкіх груп. За сухімі, афіцыйнымі фармулёўкамі справаздач аб адпрацаваных чалавека-гадзінах — плён намаганняў калектыву БДУ.

У графе «Заўвагі аб выкананні работы» нярэдка сустракаюцца словы ўдзячнасці за стараннасць і добрую якасць работы. Вось БУ-10 дзякуе студэнтам ФПМ, а БУ-7 — гісторыкам. Але больш за ўсё падзяк у фізікаў.

На просьбу назваць тых, хто найбольш вызначыўся ў час работы, члены факультэцкага штаба правядзення камуністычнага суботніка, якім кіруе намеснік сакратара партбюро фізфака В. А. Гайсёнак, без ваганняў назвалі шостую групу другога курса (камсорг Р. Цімафееў), сёмую групу трэцякурснікаў (камсорг Ю. Каленік), а таксама чацвёртую і пятую групы студэнтаў першага курса (камсоргі С. Заленскі і Л. Баканава), якія працавалі на аб'ектах ДЭУ Маскоўскага раёна горада Мінска. Асобныя групы трэцякурснікаў, а таксама студэнты старэйшых курсаў, выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта адпаведна са складзеным графікам працуюць на ўборцы свайго вучэбнага корпуса, лабараторый, кафедр, інтэрната.

«Усе на камуністычны суботнік!» — заклікае маляўнічы плакат. Калектыў універсітэта сцвярджае яго ўдарнай працай.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

## Ленінскім дням — дастойную сустрэчу!

У ГЭТЫЯ красавіцкія дні камсамольцы бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна рыхтуюцца да Ленінскіх дзён, якія прысвечаны 112-й гадавіне з дня нараджэння правадыра сусветнага пралетарыяту.

Усе маладыя супрацоўнікі актыўна ўдзельнічаюць у правядзенні Ленінскага заліку. Вывучаюць матэрыялы апошніх з'ездаў КПСС, ВЛКСМ і ЛКСМБ, бяруць павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. Мы дапамагаем падбіраць цікавыя выданні для адкрытага прагляду літаратуры па тэме «У. І Ленін — мысліцель, рэвалюцыянер, чалавек». Мэта прагляду — азнаёміць шырокае кола чытачоў з багацейшай тэарэтычнай спадчынай У. І. Леніна, з літаратурай аб яго жыцці і дзейнасці, аказаць практычную дапамогу ў падборы літаратуры па тэмах курсавых і дыпломных работ, навуковых даследаванняў.

Наша штодзённая праца — сціплы ўклад у агульнауніверсітэцкія дасягненні.

**Ф. МІРУШЧАНКА,**
**камсорг бібліятэкі.**

**Савецкія вучоныя! Павышайце эфектыўнасць даследаванняў! Няхай мацнее саюз навукі і вытворчасці! Слава савецкай навуцы!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 мая 1982 года).*



Доктар эканамічных навук Уладзімір Андрэевіч Кулажанка (у цэнтры) разам з аспірантамі абмяркоўвае даклады да навуковай канферэнцыі.

Фота В. Шачака.

# ДАСЛЕДУЮЦЬ СТУДЭНТЫ

**ШТОГОД КРАСАВІК ДЛЯ СТУДЭНТАЎ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПРЫНОСІЦЬ ХВАЛЯВАННЕ, АЖЫЎЛЕНАСЦЬ. І ГЭТА НЕВЫПАДКОВА. БО НАБЛІЖАЮЦЦА «ДНІ НАВУКІ», КАЛІ МЕСЦА ЗА КАФЕДРАЙ ЗОЙМУЦЬ СТУДЭНТЫ. ЯНЫ ПРАПАНУЮЦЬ УВАЗЕ ТЫХ, ХТО ЦІКАВІЦЦА, НАВУКОВЫЯ ДАКЛАДЫ, У ЯКІХ БУДУЦЬ АДЛЮСТРАВАНЫ ВЫНІКІ САМАСТОЙНАЙ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ, ВЫКАНАНАЙ У АПОШНІ ГОД.**

**«ДНІ НАВУКІ» ЎСІХ ФАКУЛЬТЭТАЎ УНІВЕРСІТЭТА ЗАВЕРШЫЦЬ 39-я АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ ДНЮ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА І 60-ГОДДЗЮ ЎТВАРЭННЯ СССР.**

У ходзе канферэнцыі каля 3000 студэнтаў выступяць з навуковымі дакладамі. Гэта будзе своеасаблівае падвядзенне вынікаў работы студэнцкіх навуковых гурткоў, навукова-даследчых лабараторый (СНДЛ). Шэраг дакладаў будзе зроблены па распрацоўках гасдагаворнай і дзяржбюджэтнай тэматыкі кафедр, па выніках НДР на ВА «Інтэграл» і ў інстытутах АН БССР.

Гэта свята навукі стане аглядам лепшых навуковых дасягненняў нашага студэнцтва. У яго праграме — выступленні вядучых вучоных універсітэта, прадстаўнікоў адміністрацыі, загадчыкаў кафедр, стэндавыя даклады, даклады гасцей універсітэта і г. д. На факультэцкіх канферэнцыях у абмеркаванні дакладаў будуць прымаць удзел і студэнты малодшых курсаў, аспіранты і выкладчыкі кафедр. Удзел студэнтаў малодшых курсаў асабліва каштоўны тым, што гэта дазволіць ім у першыя гады вучобы падрабязна азнаёміцца з напрамкамі работы кафедр, дапаможа раней вызначыць сваю будучую спецыялізацыю.

Практыка паказвае, што ўзровень дыпломных і курсавых работ, выкананых студэнтамі, якія займаюцца НДР з 1—2 курсаў, у цэлым намнога вышэй. І задача саветаў па НДРС факультэтаў і студэнцкіх навуковых саветаў — весці сістэматычную і накіраваную работу па прыцягненню студэнтаў малодшых курсаў да пасільных для іх форм навуковага пошуку.

З чым жа прыйшлі студэнты універсітэта да красавіцкай канферэнцыі 1982 года?

Усімі формамі НДР у БДУ ахоплена 7400 студэнтаў дзённай формы навучання, што складае 78 працэнтаў іх агульнай колькасці.

На працягу бягучага навучальнага года ў БДУ былі праведзены 3 агульнауніверсітэцкія канферэнцыі, на якіх былі заслуханы 3192 даклады. Акрамя таго, прайшоў шэраг канферэнцый, арганізаваных асобнымі кафедрамі, і прысвечаных юбілеям вядомых вучоных і пісьменнікаў.

Студэнтамі ў сааўтарстве з выкладчыкамі былі апублікаваны 262 навуковыя работы, атрымана 21 аўтарскае пасведчанне.

Сярод сааўтараў вынаходніцтваў студэнты хімфака Т. Жаўнерка, А. Куляшова, А. Вараб'ёва, студэнт фізічнага факультэта В. Чэркас і многія іншыя.

Студэнты БДУ ўдзельнічаюць у распрацоўцы гасдагаворных тэм. У 1981—1982 гг. імі выкананы аб'ём работ на суму больш чым 200 тысяч рублёў. Гэта прыкметны ўклад у народную гаспадарку, непасрэдная практычная аддача студэнцкай навукі.

Формы работы савета па НДРС універсітэта і навуковага студэнцкага савета разнастайныя. Але ў асноўным намаганні саветаў па НДРС універсітэта і факультэтаў накіраваны на арганізацыю навукова - даследчай работы студэнтаў у пазавучэбны час. Конкурсы студэнцкіх навуковых работ, выстаўкі, канферэнцыі, студэнцкія алімпіяды, безумоўна, дапамагаюць праявіцца даследчай актыўнасці студэнтаў.

Штогод студэнты БДУ на ўсесаюзным і рэспубліканскіх конкурсах атрымліваюць каля 300 узнагарод. У 1981 годзе 99 работ студэнтаў было прадстаўлена на Усесаюзны конкурс па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, 18 з іх былі адзначаны граматамі і дыпломамі. Работа выпускніка хімічнага факультэта А. Вечара адзначана медалём і грашовай прэміяй. Па выніках рэспубліканскага конкурсу дыпломамі адзначана 226 студэнтаў і 14 — грашовымі прэміямі.

Каля 90 працэнтаў студэнтаў універсітэта прынялі ўдзел у І туры конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. 40 лепшых работ былі прапанаваны на ІІ і ІІІ тур конкурсу.

Гаворачы пра НДР студэнтаў, нельга не спыніцца на рабоце нашых СНДЛ. Сёння іх ва універсітэце функцыянуе 16. І яны аб'ядноўваюць каля 500 студэнтаў, якія працуюць над рашэннем канкрэтных народнагаспадарчых задач.

Так, напрыклад, СНДЛ факультэта радыёфізікі і электронікі — лепшая СНДЛ БДУ (кіраўнік — дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ У. І. Мікуловіч) вядзе тэарэтычныя і эксперыментальныя даследаванні па стварэнню сродкаў і метадаў апрацоўкі сігналаў, апаратуры для аналізу вібрацый механічных сістэм. Гэтыя даследаванні прымяняюцца для дыягностыкі рухавікоў.

СНДЛ кафедры тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі (кіраўнік — дацэнт Ю. С. Харын) закончыла работу ў рамках дагавора аб навукова-даследчай садружнасці па распрацоўцы алгарытмаў статыстычнай класіфікацыі выпадковых працэсаў. Вынікі гэтай работы ўкаранёны з эканамічным эфектам у 20 тысяч рублёў.

**А. НІКІЦЕНКА,**
**намеснік старшыні савета па НДРС універсітэта.**

# Плячо настаўніка

**З МІКАЛАЕМ АЛЯКСАНДРАВІЧАМ ПАКЛОНСКІМ**, супрацоўнікам Інстытута прыкладных фізічных праблем я сустрэлася напярэдадні дня навукі, каб пагаварыць аб удзеле студэнтаў у навуковай рабоце.

За плячыма М. А. Паклонскага гады вучобы на фізічным факультэце і ў аспірантуры, праца на кафедры, а цяпер — у лабараторыі электронных метадаў эксперыментальнай фізікі НДІ ПФП. На яго рахунку два аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы.

Для Мікалая Аляксандравіча навуковая работа пачалася яшчэ ў студэнцкія гады, калі ён займаўся ў групе В. Ф. Стэльмаха. Знамянальнай падзеяй было першае выступленне з дакладам на студэнцкай навуковай канферэнцыі.

— Сур'ёзнае захапленне навукай, — расказвае М. А. Паклонскі, — прыходзіць праз асабістае жаданне, намаганні. Першы поспех дапамагае паверыць у свае сілы, становіцца штуршком да яшчэ больш плённай работы.

Ад свайго навуковага кіраўніка студэнт заўсёды павінен атрымліваць максімальную нагрузку і арыенцір на шляху да дасягнення мэты.

У студэнта, калі ён робіць першыя крокі ў навуцы, кіраўнік павінен быць амаль трэнерам. Бо якімі б ні былі здольнасці, іх патрэбна развіваць, талент расціць.

Я прыхільнік працы з маленькімі групамі студэнтаў, каб была магчымасць удзяліць увагу кожнаму.

...Дзверы адчыніліся, і з намі прывітаўся малады чалавек.

— Гэта мой калега і вучань Валодзя Самуйлаў. Я паступіў у аспірантуру, а ён — на першы курс фізічнага факультэта. Я паехаў разам з іх групай на сельскагаспадарчыя работы. Потым чытаў ім лекцыі па фізіцы. Так мы і пазнаёміліся.

Пасля заняткаў Валодзя прыходзіў да мяне ў лабараторыю. Дапамагаў праводзіць эксперыменты, рашаў задачы. Для набыцця больш глыбокіх ведаў па тэорыі ён шмат займаецца ў бібліятэцы. Рыхтаваў курсавую работу пад маім кіраўніцтвам. Займаліся з намі яшчэ тры студэнты. Усе закончылі універсітэт на выдатна. Валодзя зараз працуе разам са мной.

Я папрасіла Мікалая Аляксандравіча расказаць, як плённа займаюцца навуковай работай яго студэнты.

— Іх праца адлюстроўваецца ў навуковых артыкулах, выступленнях на канферэнцыях, вынаходніцтвах. Дарэчы, лепшыя нашы студэнты нядаўна прымалі ўдзел ва Усесаюзнай навуковай канферэнцыі ў Новасібірску.

Наша размова скончылася. Мікалай Аляксандравіч паказаў мне партрэт італьянскага фізіка Энрыка Фермі, што вісеў на самым бачным месцы ў лабараторыі, і сказаў: «Мой настаўнік»...

**С. ЛОЙКА.**



Навука патрабуе захопленых...

Фотаэцюд В. Шачака.

# ШТОДЗЁННЫ ПОШУК

ЗДАЛОСЯ, што я трапіла ў нейкі невядомы свет, дзе замест слоў і рухаў — мільганне рознакаляровых агеньчыкаў ды загадкавае патрэскванне прылад. Але на тварах студэнтаў — задавальненне і ўпэўненасць. Ідзе чарговы практыкум.

Каля 300 студэнтаў-трэцякурснікаў дзённага і чацвёртакурснікаў вячэрняга аддзялення фізічнага факультэта праводзяць практычныя заняткі па курсу ядзернай фізікі ў гэтай вучэбнай лабараторыі. Каб даць магчымасць студэнтам працаваць больш хутка і цікава, створана шмат дапаможнікаў: ратапрынтнае выданне, дзе тлумачыцца сутнасць кожнай работы, планшэты з асноўнымі формуламі і графікамі. На сталах — таблічкі з назвай кожнай практычнай работы, каб у час заняткаў можна было лёгка і хутка арыентавацца.

Загадчыца лабараторыі Эльвіра Аляксандраўна Аўданіна і Людміла Веніямінаўна Качарская, дацэнт кафедры ядзернай фізікі, успамінаюць гісторыю стварэння лабараторыі, якая была арганізавана амаль 20 гадоў назад. Расказваюць, як нялёгка было яе абсталяваць.

Пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1981 год на кафедры пераможцай стала лабараторыя Э. А. Аўданінай і Л. В. Качарскай. Гэта — вынік самаадданай працы.

Лабараторыя аснашчана сучаснымі прыладамі на інтэгральных схемах і транзістарах. Трэба адзначыць, што такое абсталяванне, як тут, ёсць рэдка ў якіх навучальных установах, таму да Э. А. Аўданінай і Л. В. Качарскай часта звяртаюцца за парадамі калегі з іншых навучальных устаноў.

Работа іх — штодзённы пошук.

— Гэта ж нават самім нецікава з году ў год рабіць адно і тое ж, — адзначае Людміла Веніямінаўна. — Вось і ў гэтым семестры ў нас ужо ўведзены дзве новыя практычныя работы.

З Дрэздэна нядаўна прывезлі два спектрометры. На базе іх паявілася магчымасць паставіць лабараторную работу. Старыя прылады замяняюцца новымі, значна лепшымі. Некаторыя з іх ствараюцца тут, на месцы.

Для творчай працы студэнтаў створаны ўсе ўмовы. Тут выконваюцца курсавыя, дыпломныя, навукова-даследчыя работы.

— Усё, што мы зможам зрабіць для аснашчэння лабараторыі ва універсітэцкіх умовах, — зробім. Гэта вельмі цікавая і перспектыўная лабараторыя, — адзначыў загадчык кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі прафесар Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч. — Наперадзе — новыя даследаванні і навуковыя адкрыцці.

**В. САЗАНАВЕЦ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі, член прэс-цэнтра прафкома.**

● СУПРАЦОЎНІЦТВА

**«БДУ — «ІНТЭГРАЛ»**

# АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ

У ПАСТАНОВЕ ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік» указваецца на тое, што пры падрыхтоўцы да юбілею Радзімы неабходна ярка і аргументавана прапагандаваць гістарычныя перавагі і дасягненні сацыялізму ў рашэнні сацыяльна-палітычных, эканамічных і нацыянальных праблем, курс XXVI з'езда КПСС на далейшае ўмацаванне дружбы народаў СССР.

Іменна гэта задача была адной з асноўных пры правядзенні адзінага палітдня на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл». У гэтым важным мерапрыемстве ўдзельнічалі 25 выкладчыкаў БДУ імя У. І. Леніна. Адкрыў палітдзень намеснік галоўнага інжынера ВА «Інтэграл» М. А. Каралёў. Затым у многіх падраздзяленнях госці выступілі з дакладамі. З цікавасцю слухалі, напрыклад, работнікі цэха № 31 лекцыю дацэнта кафедры гісторыі СССР Л. А. Міхайлоўскага «Утварэнне СССР — трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі». «Савецкі лад жыцця» — такая была тэма даклада дацэнта кафедры навуковага камунізму В. І. Гамава, з якім ён выступіў у 34-м цэху. Дацэнт кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму П. М. Савасцёнак расказаў работнікам цэха № 32 аб праблемах сям'і і шлюбу. У актавай зале завода «Транзістар» прапагандысты аб'яднання праслухалі даклад дацэнта кафедры гісторыі філасофіі і логікі В. Ф. Беркава «Лагічныя асновы дзейнасці прапагандыста».

Вырашана і ў далейшым падтрымліваць цесныя кантакты ў плане ідэйна-выхаваўчай работы паміж калектывамі «Інтэграла» і Белдзяржуніверсітэта.

**А. ГРЫГОР'ЕЎ.**

**НА ЗДЫМКАХ: заняткі з прапагандыстамі вядзе В. Ф. Беркаў; у час адкрыцця адзінага палітдня.**







МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# ЗА МІР, ЗА ДРУЖБУ...

**У ПАЧАТКУ ГОДА НА ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ ПРЫЙШЛО ПІСЬМО З ПАРЫЖА. ЯГО АЎТАР — ВЯДОМЫ ФРАНЦУЗСКІ ЖУРНАЛІСТ І ПІСЬМЕННІК, ЧЛЕН ФКП З 1934 ГОДА АНДРЭ ВЮРМСЭР. ВЫСТУПЛЕННІ АНДРЭ ВЮРМСЭРА Ў ГАЗЕЦЕ ФРАНЦУЗСКІХ КАМУНІСТАЎ «ЮМАНІТЭ», РАМАНЫ І ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫЯ АРТЫКУЛЫ ВЯДОМЫ ШЫРОКАМУ КОЛУ ЧЫТАЧОЎ ЯК У САМОЙ ФРАНЦЫІ, ТАК І ЗА ЯЕ МЕЖАМІ. У СВАІМ ПІСЬМЕ ЁН ЗВЯРТАЕЦЦА ДА ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ НАВУЧАЮЦЦА НА ФАКУЛЬТЭЦЕ. СЁННЯ ГАЗЕТА ДРУКУЕ ВЫТРЫМКІ З ПІСЬМА І КАЛЕКТЫЎНАГА АДКАЗУ АНДРЭ ВЮРМСЭРУ.**

**Парыж, 26 студзеня 1982 года.**

**Студэнтам факультэта журналістыкі г. Мінска.**

**Дарагія мае сябры!**

Ваш таварыш Амаду Лі вітаў мяне ад вашага імя, што мяне ўсхвалявала і ўзрадавала.

Я нарадзіўся — магчыма — пісьменнікам, я стаў — гэта так! — журналістам толькі для таго, каб прысвяціць сябе адной мэце: справе сацыялізму, які неаддзельны ў маім разуменні ад праўды і справядлівасці.

Вы будзеце перш за ўсё тымі, кім я таксама з'яўляюся нязменна — байцамі.

Байцамі за незалежнасць вашага народа. Байцамі за пабудову сацыялізму. Я ведаю, задача будзе для вас не з лёгкіх. Вопыт паказвае нам, што прыйдзецца пераадолець значна больш цяжкасцей, чым іх магла дапусціць мая прастадушная маладосць. Байцамі за дружбу вашых краін з Савецкім Саюзам. Вы ніколі не павінны забываць, што Савецкі Саюз заўсёды стаяў і стаіць на варце справядлівасці, заўсёды працягваў руку дапамогі народам, якія змагаюцца за нацыянальную незалежнасць.

Я адкрыў для сябе Маскву амаль паўстагоддзя назад. Вось ужо амаль 10 гадоў, як я там не быў. І, напэўна, я памру, так і не пабачыўшы Мінска. Напэўна, хто-небудзь з вас і вашых выкладчыкаў наведаюць Парыж, дзе я нарадзіўся... і дзе яшчэ жыву: для мяне будзе вялікай радасцю, калі яны мяне наведаюць.

Я яшчэ раз выказваю вам сваю падзяку і яшчэ раз прашу кожнага з вас і вашых выкладчыкаў прыняць шчырыя братэрскія пачуцці вашага даўняга таварыша.

**Андрэ ВЮРМСЭР.**

***

**Паважанаму таварышу Андрэ Вюрмсэру!**

Мы атрымалі Ваша пісьмо. Яно было зачытана на агульным сходзе факультэта, дзе прысутнічалі ўсе студэнты, як замежныя, так і савецкія. Ваша пісьмо было горача ўспрынята ўсімі без выключэння: дэканатам факультэта, прафесарска-выкладчыцкім саставам, студэнтамі.

Такі эфект можна растлумачыць толькі самай шчырай і глыбокай павагай да Вас, толькі бязмежным захапленнем Вашым талентам, вастрынёй Вашага пяра, здольнага коратка і зразумела выразіць смелую думку.

Мы асабліва любім Вашы штодзённыя выступленні ў «Юманітэ». Іх лаканізм, з дапамогай якога вы можаце адным выразам нанесці па нашаму агульнаму ворагу — імперыялізму — такі ўдар, які значна мацней за маланку. Гэта яшчэ раз паказвае нам, што Вы ўсё той жа баец, якім мы захапляемся і якім Вы ніколі не пераставалі быць.

Ваша пісьмо да нас — добрая вестка. Чытаючы яго, мы кіруемся Вашымі парадамі і пажаданнямі. Мы памятаем, што недастаткова проста служыць справе сацыялізму. За яго трэба змагацца. Таму нашым дэвізам ёсць і будзе — быць перш за ўсё байцом, а толькі потым журналістам. Усе студэнты нашага факультэта прытрымліваюцца гэтага прынцыпу, маючы перад сабой яркі прыклад Вашага жыцця і барацьбы.

Ваш высокі ідэал не дае нам звярнуць з дарогі служэння справе шчасця і незалежнасці нашых народаў. І гэта служэнне немагчыма без дружбы нашых краін з Савецкім Саюзам, якому мы глыбока ўдзячны.

Шлём Вам найлепшыя пажаданні!

Моцнага Вам здароўя, доўгіх гадоў жыцця, поспехаў!

# Захоплена і своеасаблівa

СВЯТОЧНЫЯ красавіцкія дні — самыя ўрачыстыя і светлыя для студэнтаў і выкладчыкаў факультэта прыкладной матэматыкі. Шмат намаганняў давялося прыкласці ў гэтым годзе Т. Драйгал і В. Шымарову, адказным за правядзенне дзён ФПМ, дзеля таго, каб свята стала своеасаблівым, не падобным на папярэднія.

Яно пачалося з дня адкрытых дзвярэй. Нашы студэнты і супрацоўнікі пазнаёмілі гасцей факультэта — маладых рабочых і школьнікаў — з таямнічым светам дысплеяў і перфакарт, са светам важнай і цікавай навукі. Грамадскія арганізацыі надаюць гэтаму мерапрыемству вельмі вялікае значэнне. Бо ў цяперашні час у сувязі з ростам прыкладных даследаванняў і укараненнем у народную гаспадарку аўтаматызаваных сістэм кіравання паўстала праблема павелічэння колькаснага і якаснага саставу спецыялістаў-матэматыкаў.

Нягледзячы на тое, што на факультэце рашаюцца важныя і складаныя праблемы і што вучыцца тут нялёгка, у нас умеюць весяліцца. Каб пераканацца, можна проста наведаць традыцыйную прэс-канферэнцыю выкладчыкаў са студэнтамі. Гэта своеасаблівае спаборніцтва гумарыстаў і эрудытаў. Асабліва бурную ажыўленасць у зале выклікалі выступленні прадстаўнікоў кафедры тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі, кафедры агульнага праграміравання.

У гэты дзень ФПМ не пазнаць. Карыкатуры і карціны лепшых майстроў жывапісу факультэта ператвараюць звычайны калідор у карцінную галерэю, якая расказвае пра жыццё студэнтаў. Свята факультэта ў гэтым годзе запомніцца не толькі кірмашом, але і дзейнічаючай «электроннай свахай».

Першакрасавіцкі вечар. Хто са студэнтаў нашага факультэта можа забыць гэту падзею? Апладысментамі было сустрэта выступленне в. а. дэкана факультэта В. І. Карзюка. Ён расказаў пра поспехі і дасягненні ФПМ за мінулы год, уручыў граматы і аб'явіў падзякі лепшым студэнтам, якія паказалі выдатныя рэзультаты ў вучобе і добра праявілі сябе ў грамадскай рабоце. З прывітальнай прамовай ад імя ўсіх гасцей выступіла студэнтка Гомельскага універсітэта І. Кулагіна. У заключэнне ўрачыстай часткі былі падведзены вынікі спартыўных спаборніцтваў паміж студэнтамі і выкладчыкамі факультэта.

Затым — пасвячэнне першакурснікаў у вялікае брацтва студэнтаў. Стаялі яны ўрачыстыя, усхваляваныя, а нам успаміналіся уласнае мінулагодняе хваляванне і знаёмыя словы клятвы.

Адшумелі чарговыя дні ФПМ. Наступная гадавіна з дня заснавання факультэта будзе трынаццатай. Але мы спадзяёмся правесці яе гэтак жа весела, захапляюча.

**А. КУЗНЯЦОВА,**
**студэнтка II курса ФПМ,**
**слухачка аддзялення журналістыкі ФГП.**

ПРАЙШЛІ ДНІ ФАКУЛЬТЭТАЎ

# Змястоўна і цікава

...З САМАЙ раніцы ішоў дождж. Але перад вучэбным корпусам на вуліцы Курчатава было мнагалюдна. Тут праходзіў мітынг, прысвечаны адкрыццю дзён радыёфізіка...

Свята працягвалася ў актавай зале галоўнага корпуса. Намеснік дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі С. Г. Някляеў павіншаваў студэнтаў, выкладчыкаў, гасцей. Слова было прадастаўлена гасцям, якія прыехалі на свята з розных куткоў краіны: з Масквы, Харкава, Ерэвана, Тбілісі.

Потым у арыгінальнай форме юнакі і дзяўчаты расказалі аб сваім студэнцкім жыцці. Спектакль быў вясёлым, цікавым. Выкарысталі ўсё магчымае: і песні, і вершы, і музыку. Прыгожымі былі дэкарацыі і касцюмы, захапляў сюжэт.

Па-майстэрску выконвалі свае ролі Сяргей Кунцэвіч, Алег Рыжкоўскі, Алена Зайцава і многія іншыя. А ў канцы, калі сціхлі апладысменты і авацыі, са сваіх месц узняліся першакурснікі, і пачалося пасвячэнне іх у студэнты.

У праграму дзён радыёфізіка ўваходзіла студэнцкая навуковая канферэнцыя, да якой было падрыхтавана каля 300 дакладаў.

Змястоўна, весела і цікава прайшла традыцыйная прэс-канферэнцыя з выкладчыкамі факультэта. Спадабаўся ўсім капуснік, на якім выступіў студэнцкі тэатр «Калізей» Беларускага політэхнічнага інстытута. Вясёлыя сцэнкі са студэнцкага жыцця паказалі госці з Харкаўскага універсітэта. А сябры з Маскоўскага энергетычнага інстытута выступілі з акрабатычна - эксцэнтрычнай праграмай.

Не ўсім давялося паказаць сваё ўменне на сцэне, але многія маглі гэта зрабіць на дыскатэках. Танцавальныя праграмы былі цікавымі, вясёлымі. І калі гучала музыка, стаяць ля сцен не было ахвоты...

**Н. ШЧАЛКАНОГАВА,**
**студэнтка журфака.**





**У мінулую пятніцу ў актавай зале універсітэта адбыўся спартыўны вечар, прысвечаны падвядзенню вынікаў XXXIX круглагадавой агульнауніверсітэцкай спартакіяды і завяршэнню чарговага агляду-конкурсу спартыўна-масавай работы сярод факультэтаў.**

**На вечары прысутнічалі рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы, старшыня рэспубліканскага савета ДСТ «Буравеснік» Я. Р. Копаць, трохразовы алімпійскі чэмпіён і неаднаразовы чэмпіён свету па вольнай барацьбе А. В. Мядзведзь, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі кампазітар Ігар Лучанок.**

Фота **В. Шачака.**

# «УЗГАРАЛАСЯ ПОЛЫМЯ...»

**ПАВЕЛ ТКАЧОЎ**

**ПІСЬМЕННІК ПАВЕЛ ІВАНАВІЧ ТКАЧОЎ (ДОКТАР ФІЛАЛАГІЧНЫХ НАВУК, ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ) ВЯДОМЫ ЧЫТАЧАМ ЯК АЎТАР КНІГ ПРА У. І. ЛЕНІНА — «ВІШНЁВАЯ КВЕЦЕНЬ. АПАВЯДАННІ ПРА У. І. ЛЕНІНА» (ДАРЭЧЫ, ГЭТАЯ КНІГА ДВОЙЧЫ ВЫДАВАЛАСЯ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ПЕРАКЛАДЗЕНА НА РУСКУЮ І ЧУВАШСКУЮ МОВЫ), «СЭРЦА КАМУНАРА», «ПІЛІПКА З ГАЛУБІНАЙ СЛАБОДКІ», «ІМЯ ЛЕНІНА Ў СЭРЦЫ НАШЫМ», «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ. ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА ІЛЬІЧА» І ІНШЫЯ. У 1980 ГОДЗЕ ВЫЙШАЎ АДНАТОМНІК ВЫБРАНЫХ ТВОРАЎ ПРА У. І. ЛЕНІНА ПАЎЛА ТКАЧОВА «ЧАС СВІТАЛЬНАЙ ЗОРКІ».**

**У ХУТКІМ ЧАСЕ НА ПАЛІЦАХ КНІГАРАНЬ ПАЯВІЦЦА АПОВЕСЦЬ-ПАДАРОЖЖА ПА ЛЕНІНСКІХ МЯСЦІНАХ, МУЗЕЯХ, ДАКУМЕНТАХ ПАЎЛА ТКАЧОВА «УЗГАРАЛАСЯ ПОЛЫМЯ...», У ЯКОЙ РАСКАЗВАЕЦЦА ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ ЛЕНІНА ДА 1917 ГОДА.**

**РЭДАКЦЫЯ ПРАПАНУЕ ЎВАЗЕ ЧЫТАЧОЎ УРЫВАК З ГЭТАЙ КНІГІ.**

...ЖНІВЕНЬСКІМ вечарам 1900 года ўладальнік мюнхенскай друкарні гер Максімус Эрнст, вядомы ў шырокіх колах нямецкіх лібералаў як чалавек радыкальных, нават сацыял-дэмакратычных поглядаў, праглядаў газеты.

...У Швейцарыі пачалася забастоўка тэкстыльшчыкаў... Паліцыя вымушана ўжыць дубінкі... «Вымушана», — з усмешкай паўтарае гер Эрнст.

...З Расіі паступаюць не менш трывожныя весткі: па начах палаюць панскія маёнткі...

Бастуюць рабочыя Пецярбурга, Харкава, Тыфліса...

Думкі гера Эрнста перапыняе стук у дзверы.

— Хто там?

— Вам, гер... — схіліўшы бялявую галоўку, дзяўчына падала геру Эрнсту тэлеграму.

— Тэлеграма?! Цікава — ад каго? А вы... вы можаце ісці.

Тэлеграма была са швейцарскага мястэчка Везена. Эрнст хутка прабег вачыма яе змест. У ёй была просьба, каб ён, гер Эрнст, «прыпыніў машыну». Што гэтыя словы азначалі, Эрнст ведаў: трэба было спыніць усю падрыхтоўчую работу да выпуску падпольнай сацыял-дэмакратычнай рускай газеты... Як жа яна павінна была называцца? Здаецца, «Искра»... Так, так «Искра». Аб ёй вельмі горача гаварыў малады рускі сацыял-дэмакрат па прозвішчу... здаецца, Пятроў. Эрнста пазнаёміў з ім доктар Леман. І яны дамовіліся, амаль аб усім дамовіліся. Вядома, рызыкоўна, але гер Эрнст не мог адмовіць... Рускі гэтак далікатна (на добрай нямецкай мове!) і ў той жа час натхнёна і пераканаўча гаварыў аб значэнні газеты для заняволенага рускага народа. Давялося пагадзіцца. Праўда, рускі сацыял-дэмакрат не так ужо многа абяцаў плаціць...

І вось — «прыпыніць машыну». Што здарылася?

Сапраўды, што здарылася? Чаму Уладзімір Ільіч (а дамаўляўся з Эрнстам ён) вымушаны быў паслаць такую тэлеграму?

У канцы ліпеня 1900 года Уладзімір Ільіч, закончыўшы ўсю падрыхтоўчую работу па стварэнню агульнарускай марксісцкай газеты, пакідае Расію.

Па дарозе ў Швейцарыю ён наведвае Германію, дзе вядзе перагаворы са штутгарцкімі і мюнхенскімі сацыял-дэмакратамі, каб тыя памаглі выдаваць «Искру».

У цяжкіх умовах праведзена велізарнейшая арганізацыйная работа: у Расіі пачалі працаваць агенты будучай газеты — недахопу ў матэрыяле не будзе, ёсць дамоўленасць з уладальнікам друкарні, знойдзены сродкі, пакуль невялікія, але для пачатку хопіць. Потым падтрымаюць сваю газету рабочыя...

Заставалася дробязь — стварыць рэдакцыю і прыступіць да выдання газеты. Але гэтая «дробязь» з'явілася вялікай перашкодай, якая ледзь не пагасіла «Искру».

У жніўні Уладзімір Ільіч прыехаў у Цюрых, дзе на працягу двух дзён вёў размовы з П. Б. Аксельродам, адным з паплечнікаў Г. В. Пляханава.

Аксельрод падтрымліваў пачынанне Леніна. Ён падкрэсліваў, што для групы «Вызваленне працы» выданне газеты і часопіса азначае паўнакроўнае жыццё. Толькі выдаваць газету і часопіс неабходна ў Жэневе... Так, так, у Жэневе.

— Не, — адказваў Уладзімір Ільіч, — лепш у Германіі. Германія з Расіяй мае агульную граніцу, а значыць, і лепшыя магчымасці для дастаўкі.

Але Аксельрод даводзіў сваё. Ленін сустрэўся з Пляханавым. І адразу ж зразумеў: Пляханаў вядзе сябе няшчыра. Часам ён адмаўляецца ад сарэдактарства і хоча быць простым супрацоўнікам, пры гэтым гаворыць так, нібы хоча паказаць: што вы будзеце рабіць без мяне? А часам паводзіць сябе ўладарна, па-дыктатарску, і адразу відаць, што хоча захапіць у свае рукі рэдактарства.

Міне яшчэ тыдзень, і Уладзімір Ільіч зробіць падрабязныя нататкі аб сустрэчах і перагаворах з Пляханавым. З таго часу прайшло шмат год, але і зараз нельга без хвалявання чытаць ленінскія нататкі «Як ледзь не патухла «Искра».

«Искра» ўсё-такі не патухла! Успыхнула, асвятляючы ўсе цёмныя куткі царскай Расіі, згуртоўваючы вакол сябе рабочы клас, рускія марксісцкія арганізацыі.

«Искра» ўспыхнула толькі дзякуючы Уладзіміру Ільічу, яго вытрымцы, настойлівасці, уменню пераканаць, давесці сваю правату.

Пры апошняй сустрэчы было вырашана: у састаў рэдакцыі ўвойдуць Ленін, Аксельрод, Засуліч, Патрэсаў, Пляханаў. Пляханаў мае два галасы. (На адной з сустрэч Пляханаў даў згоду на сарэдактарства пры ўмове, што ён будзе мець два галасы пры рашэнні спрэчных пытанняў. Давялося пагадзіцца). Але «Искра» будзе друкавацца не ў Жэневе, як таго патрабаваў Пляханаў, а ў Германіі.

І рэдакцыя, вядома, будзе знаходзіцца там, у Германіі, на значнай адлегласці ад эмігранцкіх колаў, якія б толькі перашкаджалі рабоце рэдакцыі. У Германіі паселяцца тры рэдактары — Ленін, Патрэсаў, Мартаў, астатнія будуць час ад часу прыязджаць на нарады, каб вырашыць тое ці іншае пытанне.

Патрэбна было брацца за справу, за вялікую, неадкладную справу. І Уладзімір Ільіч спяшаецца ў Германію. Яму прапануюць крыху адпачыць.

Адпачыць? Хіба зараз час для гэтага. Не, ён не можа. І вечарам 28 жніўня Ленін выязджае з Жэневы ў Нюрнберг, дзе абмяркоўвае пытанне аб выданні «Искры» з Адольфам Браўнам, адным з кіраўнікоў баварскай сацыял-дэмакратычнай партыі.

6 верасня Уладзімір Ільіч быў ужо ў Мюнхене, дзе з дапамогай нямецкіх сяброў, у прыватнасці Клары Цэткін, а таксама польскага рэвалюцыянера і публіцыста Юліяна Мархлеўскага (Карскага), які добра ведаў Германію, вырашае шэраг практычных мерапрыемстваў.

Першы нумар «Искры» будзе друкавацца ў Лейпцыгу, нават не ў самым цэнтры, а на ўскраіне, у раёне Прабсгайда. Там лягчэй даставаць рускі шрыфт. Уладальнік друкарні сацыял-дэмакрат Герман Рау згодзен, ды і паліцыі не лёгка адшукаць друкарню «Искры».

...Невялічкі пакойчык. Да столі прымацавана лямпа. Ля наборнай касы завіхаецца польскі сацыял-дэмакрат Блюменфельд. Тут жа знаходзіцца і Уладзімір Ільіч. Ён настройвае лямпу, каб святло ад яе падала на касы.

— Ну, што, таварыш, пачнём? — пытаецца Блюменфельд.

— Давайце.. — згодна ківае Ленін.

Спрытна мільгае рука наборшчыка: літара да літары — радок. Радок за радком, радок за радком—нараджаецца першы нумар «Искры». 10 дзён амаль не выходзіў з друкарні Уладзімір Ільіч — усё працаваў: правіў артыкулы, вёў карэктуру...

24 снежня (па старому стылю) 1900 г. выйшла «Искра». На першай старонцы артыкул Леніна «Неадкладныя задачы нашага руху».

Зараз у доме № 48 па вуліцы Рускай — Русенштрасе — у невялічкім аднапавярховым будынку размясціўся музей У. І. Леніна. Ён быў адкрыты 7 мая 1957 года. Ля ўваходу — помнік Леніну. Тут заўсёды букеты жывых кветак — сведкі неўміручай любві да Леніна мільёнаў працоўных усяго свету. Ля помніка наведвальнікаў сустракае экскурсавод. Давайце разам з ім, сябры, пройдземся па залах музея.

Музей — тры невялікія пакойчыкі. У вітрынах пісьмы, працы Леніна, якія ён пісаў, знаходзячыся ў Германіі: «З чаго пачаць?», «Што рабіць?» і іншыя. Фотаздымкі Уладзіміра Ільіча, Надзежды Канстанцінаўны, а таксама тых, хто працаваў разам з ім над стварэннем марксісцкай партыі... Па дакументах, якія знаходзяцца тут, можна прасачыць увесь слаўны шлях ленінскай «Искры»...

У апошняй зале знаходзіцца друкарня. Друкарскі станок і побач наборны цэх з невялічкімі касамі. Пад столлю — лямпа, якая асвятляе газету «Искра», што ляжыць на наборнай касе...

У. І. Ленін вельмі многа працаваў, і яму нават не было часу ўладкаваць асабісты быт. Пад прозвішчам Мейера (потым балгарскія таварышы далі яму пашпарт на імя балгарына Іарданава) Уладзімір Ільіч пасяліўся ў невялічкім пакойчыку ў адным з рабочых кварталаў Мюнхена. Перапіску з рускімі таварышамі вёў у асноўным праз чэха Мадрачэка, які быў у Празе. У пісьмах гэтага часу да родных сустракаліся такія радкі:

«Ужо не так далёка і Надзін прыезд... І тады я ўладкуюся зусім як мае быць».

З гэтых радкоў відаць, як Уладзімір Ільіч чакаў Надзежду Канстанцінаўну. Нарэшце, надышоў красавік 1901 года... Аб сваёй паездцы за мяжу да Уладзіміра Ільіча Надзежда Канстанцінаўна пазней успаміхала:

— Калі я прыехала ў Мюнхен, Уладзімір Ільіч жыў без прапіскі ў гэтага самага Рытмейера, зваўся Мейерам. Хаця Рытмейер і быў уладальнікам піўной, але быў сацыял-дэмакрат і хаваў Уладзіміра Ільіча на сваёй кватэры».

А ці ж бачыўся Уладзімір Ільіч з герам Эрнстам, уладальнікам мюнхенскай друкарні? Бачыўся, і не толькі бачыўся, а і выдаваў газету ў яго друкарні. Дарэчы, толькі першы нумар «Искры» быў надрукаваны ў Лейпцыгу, потым яна выдавалася ў друкарнях Мюнхена, Штутгарта...

● **ПРЭСАЎТАКЛУБ**

# АГЛЯД БЯСПЕКІ РУХУ

УСЕСАЮЗНЫ веснавы агляд бяспекі дарожнага руху пачаўся 1 красавіка. Мэта агляду — падрыхтоўка транспарту для работы ў вясенне-летні перыяд, калі значна ўзрастае інтэнсіўнасць руху: павялічваецца аб'ём пасажырскіх і грузавых перавозак, мільёны ўладальнікаў аўтамабіляў і матацыклаў паяўляюцца на аўтамабільных дарогах.

Да правядзення агляду прыцягваюцца дарожныя арганізацыі. Бо іменна ад іх залежыць перш за ўсё стан вуліц і дарог. Пасля зімы патрэбна правесці бягучы рамонт дарожнага палатна і ўзбочыны, абнавіць і ўстанавіць новую дарожную інфармацыю. Неабходна зрабіць усё для таго, каб рух быў бяспечным і зручным, каб вадзіцелі лёгка арыентаваліся на дарогах.

Вядома, што на стан аварыйнасці ўсё больш уплыў аказваюць індывідуальныя ўладальнікі машын і матацыклаў, якіх зараз у Мінску ўжо больш за 70 тысяч. Ва ўмацаванні іх дысцыпліны шмат залежыць ад добраахвотных таварыстваў аўтамотааматараў. З 10 лютага па 30 верасня 1982 года ў Мінску праводзіцца аперацыя «Аўтамотааматар», задача якой — дабіцца значнага ўмацавання дысцыпліны дарожнага руху на транспарце індывідуальных уладальнікаў і памяншэння аварыйнасці на гэтым відзе транспарту. Разгарнуць шырокую прапаганду, узмацніць кантроль за паводзінамі вадзіцеляў уласнага транспарту на дарогах, падрыхтаваць аўтамабілі да тэхнічнага агляду, дапамагчы пасля доўгай зімы аднавіць практычныя навыкі ваджэння.

Асаблівую ўвагу патрэбна ўдзяліць юным удзельнікам дарожнага руху — дзецям. Вясной і летам яны часцей бываюць на вуліцы, але асцярожнасць праяўляюць, на жаль, не заўсёды. Ахаваць нашых маленькіх грамадзян ад выпадковасцей на вуліцах і дарогах — клопат не толькі работнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, не толькі бацькоў і педагогаў, але і кожнага дарослага чалавека.

Поспех веснавога агляду бяспекі дарожнага руху ў многім залежыць ад яго масавасці. Акрамя служб ДАІ, у гэтай важнай справе заклікаіы прыняць актыўны ўдзел усе работнікі аўтатранспартных прадпрыемстваў, дарожных арганізацый, якія маюць адносіны да забеспячэння бяспекі дарожнага руху, а таксама вялікая армія дружыннікаў-аўтаінспектараў.

**С. ЯЎСЕЕЎ,**
**супрацоўнік ДАІ.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

15 красавіка 1982 г.

АТ 21220 Заказ 763.

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 20-68-27.**

**Рэдактар**

**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**